Пераможцы ўніверсітэцкіх алімпіяд змогуць праліычыць свае шансы на паступленне ва УВА пасля 1 красавіка.

# Унікальная траекторыя


Рэктар ПДУ Ю.Раманоўскі і К.Верын.

## Ва ўніверсітэт — першымі

У 21 рэгіянальнай УВА падвялі вынікі ўніверсітэцкіх алімпіяд. У заключным этапе, які адбыўся 22—23 лютага і 1 сакавіка, удзельнічалі 3,6 тысячы адзінаццацікласнікаў з усёй краіны, у тым ліку і мінчане. Уладальнікамі дыпломаў (I, II, III ступеней) сталі больш за 1,3 тысячы чалавек.

— У топ-5 УВА — лідараў па колькасці пераможцаў універсітэцкіх алімпіяд увайшлі ВДУ імя П.М.Машэрава (195), ГрДУ імя Янкі Купалы (127), ПДУ імя Еўфрасінні Полацкай (109), ГДУ імя Ф.Скарыны (100), БрДУ імя А.С.Пушкіна (93). Штогод у алімпіядзе ўдзельнічаюць моцныя дзеці з высокімі баламі па вучэбных прадметах, — расказала кансультант упраўлення вышэйшай адукацыі Галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Наталля Жытнікава.

Усе пераможцы алімпіяды рэкамендаваны да залічэння без уступных іспытаў на запатрабаваныя спецыяльнасці. Стаць студэнтамі яны змогуць ужо ў першай палове ліпеня, падаўшы дакументы адначасова з мэтавікамі, і, адпаведна, будуць залічаны да пачатку асноўнага этапу падачы дакументаў.

— Па 1 красавіка на сайтах універсітэтаў, інтэрнэт-рэсурсах і ў СМІ будуць апублікаваны квоты для УВА па залічэнні пераможцаў універсітэцкіх алімпіяд. Як і ў мінулым годзе, на кожнай спецыяльнасці алімпіяднікі змогуць заняць не больш за 15% месцаў ад кантрольных лічбаў прыёму, — дадала Наталля Васільеўна.

> Па 1 красавіка на сайтах універсітэтаў, інтэрнэт-рэсурсах і ў СМІ будуць апублікаваны квоты для УВА па залічэнні пераможцаў універсітэцкіх алімпіяд.

Яна паведаміла, што ўрачыстае ўзнагароджанне пераможцаў універсітэцкіх алімпіяд у большасці УВА адбудзецца 22 сакавіка падчас правядзення адзінага дня адкрытых дзвярэй:

— Гэта добрая традыцыя. На дзень адкрытых дзвярэй прыйдуць не толькі сёлетнія выпускнікі, але і вучні 9—10 класаў, якія па прыкладзе старэйшых таварышаў у будучыні скарыстаюцца такой магчымасцю паступлення ва ўніверсітэт.

Варта адзначыць, што ўніверсітэцкія алімпіяды праходзілі пад пільным кантролем РІКВ, які фарміраваў камплект заданняў.

— Найбольш запатрабаваны ў абітурыентаў-пераможцаў медыцынскія спецыяльнасці (ГрДМУ, ВДМУ, ГДМУ). У лідарах таксама "Штучны інтэлект" і "Электронныя сістэмы і тэхналогіі" (БрДТУ). Высокую цікавасць старшакласнікі праявілі да "Гісторыі" і "Сучасных замежных моў" (ГрДУ імя Янкі Купалы), "Водных біярэсурсаў і аквакультуры" і "Абароны раслін і каранціну" (БДСГА). Безумоўна, попытам карыстаюцца інжынерныя, лінгвістычныя і педагагічныя напрамкі, — адзначыла Н.Жытнікава.

## Выдатная магчымасць

У ПДУ ў бягучым навучальным годзе алімпіяда праводзілася па пяці прадметах: "Працоўнае навучанне", "Фізічная культура і здароўе", "Гісторыя Беларусі", "Англійская мова" і "Матэматыка". У папярэднім этапе паўдзельнічалі 394 старшакласнікі, у заключны выйшлі 267. Пераможнымі дыпломамі ўзнагароджаны 109 школьнікаў. Дыпломы I ступені атрымалі 17 чалавек, II ступені — 39 і III ступені — 53.

— Удзельнікамі нашага спаборніцтва сталі адзінаццацікласнікі з усіх рэгіёнаў краіны. Вядома, больш за ўсё дзяцей было з Віцебскай вобласці — 82%, з іх 56% — гэта вучні Полацка і Наваполацка. Прыехалі да нас і навучэнцы са сталіцы і Мінскай вобласці — каля 11%, былі прадстаўнікі і ўсіх астатніх рэгіёнаў — па 1—3%, — паведаміла дырэктар Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі ПДУ Юлія Вішнякова.

> Урачыстае ўзнагароджанне пераможцаў універсітэцкіх алімпіяд у большасці УВА адбудзецца 22 сакавіка, падчас правядзення адзінага дня адкрытых дзвярэй.

Пераможцы алімпіяды маюць права на залічэнне ва ўніверсітэт без уступных іспытаў на 19 спецыяльнасцей. Некалькі з іх найбольш папулярныя ў абітурыентаў, напрыклад, "Кібербяспека". На яе летась паступіў навучэнец Ліцэя Наваполацка Канстанцін Верын, стаўшы ўладальнікам дыплома II ступені па матэматыцы.

— У 2024 годзе на гэтую спецыяльнасць быў высокі конкурс. Толькі перамога ва ўніверсітэцкай алімпіядзе па матэматыцы дазволіла мне паспяхова канкурыраваць: на тры месцы тады прэтэндавалі 12 чалавек з дыпломамі, — адзначыў юнак. — І самае важнае, што ўжо 2 ліпеня праз СМС я даведаўся, што рэкамендаваны да залічэння, чаму быў вельмі рады. Лічу, што ўніверсітэцкая алімпіяда — выдатная магчымасць для таленавітых абітурыентаў паступіць менавіта ў тую УВА, пра якую марыш.